Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА ЛКСМБ
І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя У. І. ЛЕНІНА

№ 11 (520) Субота, 30 сакавіка 1963 г. Цана 1 кап. Год выдання XVI-ы

## Першая сесія Вярхоўнага Савета БССР

**Пазаўчора, 28 сакавіка, у Мінску пачала сваю работу першая сесія Вярхоўнага Савета Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі шостага склікання.**

**Сесія аднагалосна выбрала старшынёй Вярхоўнага Савета Беларускай ССР сакратара ЦК КП Беларусі, дэпутата В. Ф. ШАУРУ.**

**Вярхоўны Савет БССР зацвердзіў рэгламент і прыняў наступны парадак дня сесіі:**

**1. Выбары Мандатнай камісіі Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.**

**2. Выбранне пастаянных камісій Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.**

**3. Аб паляпшэнні бытавога абслугоўвання насельніцтва рэспублікі.**

**4. Выбранне Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.**

**5. Утварэнне ўрада Беларускай ССР — Савета Міністраў Беларускай ССР.**

На падрыхтоўчых курсах

# Мара вядзе...

— Сёння мы будзем рашаць задачы на прымяненне закона Гей-Люсака, — гаворыць выкладчык.

Да дошкі падыходзіць маладая жанчына, пачынае рашаць. Яна хутка знаходзіць, чаму роўна работа поршня пры ізабарычным расшырэнні, вылічвае і, нарэшце (праўда, не так хутка, як гаворыцца), адказ атрыманы. Выкладчык дае дадатковыя пытанні, «ганяе» па пройдзеных тэмах, але вучаніца парыруе ўсе гэтыя «атакі», станоўча і ўпэўнена дае грунтоўныя адказы...

Гэта адбывалася не дзесьці ў школе. Такі ўрок мне давялося наведаць ва універсітэце, на занятках падрыхтоўчых курсаў для паступаючых на матфак.

Слухачы падрыхтоўчых курсаў — сталыя людзі. Усе яны знаходзяцца на тым ці іншым участку працоўнага фронту.

Святлана Рыжыкава, са знаёмства з якой пачалося маё знаёмства з будучымі студэнтамі матфака, развітаўшыся са сваімі школьнымі гадаванцамі, спяшаецца дадому. Дагледзеўшы ўсё па сямейнай гаспадарцы, яна зноў збірае падручнікі і накіроўваецца ва універсітэт. А дванаццатай гадзіне пачынаецца для яе «творчы» час. Трэба пісаць планы ўрокаў, ды і самой падрыхтаваць свае ўрокі.

— Ведаеце, даўно ўжо я скончыла тэхнікум, матэрыял крыху забыўся. На падрыхтоўчых курсах ўсё пакрысе ўсплывае ў памяці. Ды што там казаць! Ясна, што задачы і практыкаванні па фізіцы, матэматыцы цяжка разабраць без дапамогі, парад, — расказвае Святлана.

Стаць матэматыкам з вышэйшай адукацыяй — вось мара Святланы Рыжыкавай і яе цяперашніх аднакурснікаў па падрыхтоўчых курсах. Гэтая мара вядзе іх у аўдыторыі універсітэта. У Рыжыкавай ёсць сям'я, шмат энергіі патрабуе работа. Але Святлана знаходзіць час і на вучобу. Яе праца і стараннасць даюць упэўненасць, што яна дасягне сваёй мэты.

Знаходзіць час для вучобы і рабочы Васілій Ліпай. Шэсць гадоў назад ён вучыўся ў дзесяцігодцы, потым служыў у радах Савецкай Арміі, а ў гэтым годзе збіраецца паступаць у БДУ. Кожную хвіліну ён стараецца выкарыстаць для падрыхтоўкі да заняткаў, для паўтарэння пройдзенага матэрыяла.

— Для мяне праца — гэта своеасаблівая практыка, — гаворыць Васілій,— многія тэмы, асабліва па электрычнасці, сустракаюцца ў маёй практычнай рабоце. Я ж працую на электрамеханічным заводзе.

Упартасць, з якой рыхтуюцца слухачы падрыхтоўчых курсаў да ўступных экзаменаў, гаворыць: быць ім студэнтамі, быць спецыялістамі. Споўніцца іх мара.

**І. КАПЫЛОВІЧ.**

# КЛЮЧЫ ДА СТУДЭНЦКАЙ ДУШЫ

Цяжка гаварыць аб чалавеку, якога сустрэў упершыню. Першыя размовы, гутаркі, уражанні бываюць часта няправільныя, няпоўныя. Вось калі вы з'ясцё з ім, як кажуць, пуд солі, перажывёце з ім важную падзею, яшчэ раз праверыце яго, тады ваш новы знаёмы стане ясны і панятны. Так часта бывае ў жыцці. У студэнцкім — таксама.

Каго не хвалюе першая сустрэча з новым выкладчыкам?! Пакуль яшчэ мы ведаем толькі яго прозвішча. Перад заняткамі рыхтуемся сустрэць яго «ва ўсеўзбраенні»: рыхтуем сшыткі, аўтаручкі ў пальцах заціснем. З'явіцца нейкая заклапочанасць, цень на твары. Можа, так патрэбна? Ды яшчэ на працягу 90 мінут? Скажаце, не бывае? Не, бывае! Студэнты кожнага новага выкладчыка чакаюць з нецярплівасцю. Вялізнае жаданне новага голасу, свежага слова, добрай размовы аб літаратуры, мастацтве, дружбе, жыцці. Студэнты заўсёды упэўнены, што ў новага выкладчыка ёсць свой погляд, свае разуменне жыцця і творчасці пісьменніка, паэта, вучонага. А адсюль — іншы падыход да студэнтаў.

Як бы там ні было, студэнты не баяцца цяжкасцей, яны баяцца іншага: сухасці, шэрасці, абыякавасці да іх.

Таму, напэўна, студэнты другога курса вячэрняга аддзялення журналістыкі і бядуць вось ужо колькі месяцаў размовы аб тым, як чытаюцца лекцыі, як умацоўваецца з семестра ў семестр узаемасувязь студэнтаў з выкладчыкамі. І не толькі на нашым курсе.

Вядома, дыктарам радыё, тэлебачання можа працаваць не кожны, хто мае адукацыю або жаданне. Там перш за ўсё ўлічваецца здольнасць данесці да слухача жывое слова, жывую думку.

Выкладчыкі ВНУ таксама павінны мець такія здольнасці. Яны ж нашы настаўнікі, нашы старэйшыя таварышы! Мы пойдзем далёка ў будучае, а памяць аб самым дарагім чалавеку, настаўніку, будзе захоўвацца заўсёды.

Мы будзем заўсёды памятаць дацэнта Давіда Яўсеевіча Фактаровіча. Перш за ўсё, за простае, жывое, творчае ў яго адносінах да студэнтаў. Будучым настаўнікам, журналістам ёсць чаму павучыцца у Давіда Яўсеевіча. Напрыклад, вобразнасці мовы, Ад нойчы мы падлічылі, што за час лекцыі Давід Яўсеевіч ужыў, ды яшчэ як трапна, 30 прымавак, прыказак, зваротаў. Як выкладчык, ён настолькі самабытны і арыгінальны, што студэнты іншых факультэтаў зайздросцяць тым, у каго ён чытае свае курсы.

Нам давялося размаўляць з выпускнікамі БДУ, якія працуюць цяпер на Брэстчыне і Гомельшчыне. Яны з захапленнем расказвалі аб лекцыях Давіда Яўсеевіча, доўга распытвалі аб ім. З удзячнасцю гаварылі яны, што Фактаровіч навучыў іх весці гутарку, чытаць урок свабодна, лёгка, не прырастаючы да трыбуны, у меру прымяняючы і гіпербалу, і метафару, і рытарычнае пытанне, і жарт.

Студэнты гаворыць: чытаеш, чытаеш «зарубежку», нічога не зразумееш. А раскажа аб тым жа Фактаровіч, ускрыкнеш: як гэта ўсё проста!

З няменшай увагай слухаюць студэнты лекцыі па сучаснай рускай мове Людмілы Аляксандраўны Шаўчэнка. У яе ёсць штосьці сваё ў падыходзе да слухачоў. Яна з аднолькавай упэўненасцю і любоўю растлумачвае пытанні і аб фразеалагічных зваротах, і аб назоўніках, аб лічыльніках і г. д. Заўсёды падбірае такія прыклады з жыцця,

(Заканчэнне на 2 стар.)

# Да мэты!

**Стаць журналісткай я марыла яшчэ калі вучылася ў 8 класе школы рабочай моладзі. Цяпер я ўжо студэнтка другога курса вячэрняга аддзялення журналістыкі.**

**Усе ведаюць, як нялёгка працаваць і вучыцца. Я працую на мотавелазаводзе токарам. Работа адказная, патрабуе вялікага ўмення. А ўвечары спяшаюся на лекцыі. Стараюся акуратна наведваць заняткі, бо, прапусціўшы якую-небудзь тэму, цяжка будзе даганяць групу. Да практычных заняткаў трэба рыхтавацца. На дапамогу павінны прыйсці канспекты. Але гэтага мала. Тады прыходзіцца ісці ў рэспубліканскую бібліятэку імя У. І. Леніна, часта я бываю і ў бібліятэцы імя Маякоўскага.**

**Ёсць у мяне і памочніца — гэта мая пяцігадовая дачка. Калі я паступала ва універсітэт, мае сяброўкі казалі мне: «Навошта табе вучоба, табе самой ужо ёсць каго вучыць. Перашкаджаць дачка будзе». Але яны памыліліся. З першых жа дзён Света (так завуць маю дачку) праявіла вялікую цікавасць да маіх заняткаў. Асабліва ёй спадабалася мая залікоўка. У выніку мне прыйшлося падаць у дэканат заяву, каб мне выдалі новую. Спрабавала яна і пісаць у маіх канспектах. Але яна і сапраўды дапамагае мне. У любы дзень я магу спакойна рыхтавацца да лекцый. Кожны раз Света напамінае мне: «Мама, чытай кніжку», — так гаворыць яна, калі бачыць, што я спынілася і не чытаю.**

**А наогул, не так ужо і цяжка сумяшчаць работу з заняткамі. Асабліва, калі ведаеш, што ўсё твае аднакурснікі, сябры і сяброўкі, таксама і працуюць, і вучацца.**

**Тамара НОВІКАВА.**

**Ад рэдакцыі:** Тамару добра ведае другі курс вячэрняга аддзялення журналістыкі. У яе шмат сяброў, з якімі яна дзеліцца сваімі думкамі, пачуццямі.

Аднойчы Тамара расказала аб сабе. Бацькоў не памятае: яны загінулі ў час вайны. Выхоўвалася ў дзіцячым доме. Аднойчы Тома Новікава прыйшла на мотавелазавод. У цэху майстар спытаў яе: «Дзяўчынка, каго ты тут шукаеш?». І Тамара растлумачыла, што нікога яна не шукае, а прыйшла вучыцца і працаваць токарам. Вучылася ў вячэрняй школе. Цяжка было адной вучыцца і працаваць. Ды яшчэ на руках маленькая дачка. Не пашанцавала у асабістым жыцці— муж аказаўся чалавекам без сумлення, пакінуў сям'ю. Але Тамара смела ідзе ў жыццё. І на заводзе, і ў студэнцкім калектыве яна заўсёды знаходзіць верных таварышаў, дарагіх ёй людзей.

# Макаранкаўскі вечар

*У актавай зале адбыўся ўрачысты вечар, прысвечаны 75-годдзю з дня нараджэння выдатнага савецкага педагога А. С. Макаранкі. Вечар арганізавалі студэнты 3 курса геаграфічнага факультэта пад кіраўніцтвам дацэнта кафедры педагогікі і псіхалогіі С. С. Кавальчука.*

*У сваім выступленні Сцяпан Сямёнавіч Кавальчук расказаў аб важнейшых момантах жыцця і дзейнасці Антона Сямёнавіча Макаранкі, гаварыў аб яго метадах камуністычнага выхавання, падкрэсліў ролю А. С. Макаранкі ў развіцці савецкай педагогікі.*

*З дакладам аб жыцці і дзейнасці Антона Сямёнавіча выступіў студэнт Вадзім Дварнічэнка. Аб індывідуальным падыходзе да асобы ў сістэме выхавання Макаранкі расказала кандыдат педагагічных навук І. І. Разганава. Былі заслуханы таксама даклады «Аб працоўным выхаванні» (студэнт Аляксандр Хацько), «Аб фізічным выхаванні» (Валерый Кадацкі), «Аб эстэтычным выхаванні» (Аляксандр Пракаповіч).*

*Сцяпан Сямёнавіч Кавальчук дапамог студэнтам падабраць патрэбную літаратуру, даў кансультацыі па некаторых пытаннях. Дзякуючы яго самаму актыўнаму ўдзелу, вечар прайшоў вельмі цікава. Выступленні дакладчыкаў былі змястоўныя і грунтоўныя, у іх было шмат цікавых фактаў і вывадаў.*

*У заключэнне ўдзельнікі вечара прагледзелі мастацкі фільм «Сцягі на вежах» па творы А. С. Макаранкі. Адразу ж пасля дэманстрацыі фільма адбылося яго абмеркаванне.*

*Так, пабольш бы такіх вечароў!*

*В. БУНЯКІН,*
*В. БАРЫСАВЕЦ,*
*Я. ШАТАЎ,*
*студэнты 3 курса біяфака.*

# Па універсітэту

* * *

*Бібліятэка галоўнага корпуса арганізавала кніжна-ілюстратыўную выстаўку, прысвечаную 95-годдзю з дня нараджэння Аляксея Максімавіча Горкага.*

* * *

*У нядзелю на матэматычным факультэце прайшоў традыцыйны вечар сустрэчы выпускнікоў факультэта. Выпускнікі біялагічнага факультэта сабраліся на свой вечар учора, у пятніцу.*

* * *

*Ілюстраваныя стэнды-плакаты «Пад сцягам фронта вызвалення» і «Паўднёвы В'етнам» афармілі студэнты-в'етнамцы фізічнага факультэта.*

# *Стихи Виктора Халипова,*

## студента 1 курса отд. рус. языка и литературы

## Песня в руках

Как ребенок,
мир познающий,
в самом простом
необычное вижу..
вот небо,
облако,
ветер поющий
и лес у горизонта, будто подстриженный.
Капля в паутине.
Ну что необычного?
А если всмотреться —
солнце в ней,
И разве
не похожи
на косы девичьи
тени
летящих
по ветру
ветвей?!
Или вот —
совсем обыденно:
кошка,
дверь,
два котенка ползают,
а если всмотреться,
можно увидеть
глазёнки,
любопытства
ребячьего
полные.
Гляжу изумленно
глазами синими
на солнечный лучик,
проткнувший штору.
И хочется так
у него
спросить мне:
а правда,
как
на земле
здорово?!
Здорово то,
что живу я!
люблю я!
что есть у меня девчонка чудесная..
Слушай, Солнце,
хочешь любую
я отдам тебе
нашу
песню.
За то, что ты светишь,
за то, что пурга
меня научила на солнце драться,
за то, что под солнцем так трудно лгать
и так легко
улыбаться!

## Обтекаемый

Сердце, как часы
с паспортом гарантийным:
спешить не желает
и отставать тоже.
В каждом зрачке
по клочку тины.
И розовая,
без морщинок
кожа.

Любые волненья,
протекая рядом,
его не задевают
и не тревожат.
Спокойные мысли
в спокойном взгляде.
И розовая,
без морщинок
кожа.

Ближнему плохо!
Ближний гибнет!
Просит помочь!..
А он — прохожий,
его не волнуют
ни страсти,
ни ливни,
его,
с розовой,
без морщинок
кожей.

«Пустили домну!», —
пестрят газеты.
Ну что ж,
и похлопать со всеми можно.
А если авария..
со всеми не сетует
он,
с розовой,
без морщинок
кожей.

Негр с голодухи
ухнул камнем
с моста...
(нервы щекочет немножко).
Но и про это
читает, зевая,
он,
с розовой,
без морщинок
кожей.

Кто-то
в соседней квартире
живет,
прикрываясь ложью.
У этого:
часы гарантийные
и розовая,
без морщинок
кожа.

А если воруют —
на то есть милиция,
ей и бороться
по штату положено.
Стоит ли беспокоиться
и суетиться
ему,
с розовой,
без морщинок
кожей?!

Он постоянен
во взглядах,
в привычках,
чем-то
на идолов
древних
похожий:
с таким же
бесстрастным,
всезнающим
личиком
и с розовой,
без морщинок
кожей.

Он всё принимает
в жизни спокойно,
любые блага,
как нечто должное.
Он,
пьющий, жующий
живой покойник
с розовой,
без морщинок
кожей.

Но если ОН
угодит в аварию,
Помогут люди
ему всё же!
Ему,
обтекаемому и мягкому,
как валенок,
ему,
с розовой,
без морщинок
кожей.

# Ключы да студэнцкай душы

*(Пачатак на 1 стар.)*

якія мы і раней выкарыстоўвалі ў сваёй мове, але поўнага сэнсу, значэння не разумелі і не бачылі. Не цанілі крылатых слоў і выразаў. А калі і выкарыстоўвалі іх, то не да месца, без разбору і асабістых адносін да іх. А з вуснаў Людмілы Аляксандраўны мы адчулі веліч і сілу рускай мовы. Яна літаральна хварэе за кожнае няправільна вымаўленае студэнтам слова, літару, выраз. Сочыць за правільным націскам, вымаўленнем. Адвучае нас ад непатрэбных і няўмесных слоў. І не толькі ў аўдыторыі, а і на рабоце, дома, у размове з малодшымі.

Лекцыйных гадзін у вячэрнікаў удвая менш, чым у студэнтаў стацыянара. Аднак Людміла Аляксандраўна шмат намаганняў прыкладае, каб студэнты поўнасцю засвоілі тэму і ў іх ведах не было прабелаў.

У асобе Надзеі Пятроўны Нягоды мы сустрэлі чалавека, які да канца дзеліцца са студэнтамі шырынёй душы і сваімі ведамі. Праўда, некаторыя скардзяцца, што вельмі ўжо яна прыдзірлівая і няўмольная. Але ў выкладанні замежнай мовы гэта неабходна.

...Аднойчы Надзея Пятроўна прыйшла да нас на лекцыю, і мы заўважылі, што ў яе штосьці не ў парадку: або захварэла, або непрыемнасць якая была. Аказалася, што чатыры дні ў яе трымалася высокая тэмпература, і праводзіць заняткі яна прыйшла з рызыкай для здароўя. Усе занепакоіліся. Прапанавалі, каб яна апранула паліто, магчыма, пайшла дамоў. А тэму мы прапанавалі вывучыць самастойна.

Англійская мова многім на курсе даецца з цяжкасцямі. Калі ўзнікае няяснае пытанне, Надзея Пятроўна падрабязна, цярпліва растлумачвае яго. Нават пасля лекцыі застаецца, каб дапамагчы студэнту.

У цяперашнім навучальным годзе мы пазнаеміліся з Кларай Саламонаўнай Рукшыной. Мы ніколі не бачылі, каб яна рыўком адчыняла дзверы, уздыхаючы, нярвова кідала на стол папку і «страчыла» чарговую лекцыю. Зусім не.

Рабочая абстаноўка на лекцыі адчуваецца ва ўсім. Студэнты запісваюць у канспект асноўныя вехі жыцця і творчасці англійскага паэта Шэлі. Праўда, для многіх аўтар «Вызваленага Праметэя» і «Гімна інтэлектуальнай прыгожасці» ніякага значэння раней не меў. Цяпер — зусім іншая справа. Калі мы даведаліся, што Шэлі яшчэ студэнтам 2 курса стаў атэістам, што ён быў вялікі аптыміст, што ён першы пясняр радасці і любві, што ён усёй душою верыў у Чалавека, у яго усесільны розум, аўдыторыя пераўтварылася. Дзесяткі вачэй заблішчэлі, расправіліся плечы, канспекты былі забыты. Некалькі разоў мы прасілі Клару Саламонаўну прачытаць урыўкі з яго лепшых твораў. І яна чытала. Не, гэта была не лекцыя. Гэта было сапраўднае вывучэнне творчасці вялікага паэта.

Гэты артыкул служыць маім адказам на словы адной выкладчыцы (яна прасіла не называць яе прозвішча), якая прыйшла ў нашу рэдакцыю і сказала:

— Напішыце такі артыкул, каб ён прымусіў студэнтаў слухаць мае лекцыі.

І далей працягвала:

— Крычу, аж глотку дзяру. У мяне заўсёды канспекты на кафедры ляжаць, а студэнты сядзяць і смяюцца, не слухаюць.

Выкладчыца паверыла ў сілу газетнага слова, у сілу журналіста. А ў свае сілы яна не верыць. І мы ёй параілі прыслухацца да вопыту лепшых нашых выкладчыкаў, вывучыць яго. Толькі гэта дапаможа знайсці ёй шляхі да студэнцкіх сэрцаў.

**Георгій ОГІЙ.**

# На прыз газеты „Беларускі універсітэт"

Закончылася першынство БДУ на прыз газеты «Беларускі універсітэт» па шашках. У сераду адбыўся апошні тур. Перад ім становішча усіх каманд было зусім няяснае. Чатыры з іх — 3 курс матфака, 2 курс матфака, фізфак і вылічальны цэнтр — тэарэтычна і практычна маглі аказацца на любым з першых чатырох месц. У хімікаў з філолагамі ішла барацьба за тое, каб не аказацца на апошнім месцы. Яны згулялі ў заключным туры унічыю — 3:3, і другі прызёр нядаўняга каманднага першынства універсітэта, каманда хімфака, аказаўся на апошнім месцы.

**Табліца розыгрыша першынства**

| | 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | А | М |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Матфак (3 курс) | | 4 | 4½ | 2½ | 0 | 4 | 15 | IV |
| Вылічальны цэнтр | 2 | | 4½ | 2½ | 3 | 4½ | 16½ | III |
| Хімфак | 1½ | 1½ | | 1½ | ½ | 3 | 8 | VI |
| Фізфак | 3½ | 3½ | 4½ | | 3½ | 5½ | 20½ | II |
| Матфак (2 курс) | 6 | 3 | 5½ | 2½ | | 4½ | 21½ | I |
| Філфак | 2 | 1½ | 3 | ½ | 1½ | | 8½ | V |

Каманда 2 курса з нечаканым лікам 6:0 перамагла трэцякурснікаў. Яе маглі «дастаць» толькі фізікі. Для гэтага ім неабходна было выйграць у каманды вылічальнага цэнтра з лікам 4,5:1,5. Фізікі ледзь не выканалі план. Яны набралі 3,5 ачка. Але ў самай апошняй партыі першынства малодшы навуковы супрацоўнік вылічальнага цэнтра Самусеў дэманструе высокую тэхніку ў заканчэнні і бліскучым эцюдным шляхам перамагае Слюнкова.

Такім чынам, прызавыя месцы размеркаваліся так: 2 курс матфака, фізфак, вылічальны цэнтр.

Пераможцамі на дошках сталі: на 1 — Драбушэвіч (вылічальны цэнтр), на 2— Несцяровіч (2 курс матфака), на астатніх, у парадку нумароў дошак, — Сягло, Маісеенка, Слюнкоў, Хапалюк — усе з фізфака, прычым Маісеенка выканаў норму першага разраду.

Рэдактар У. КУЛАЖАНКА.

Адрас рэдакцыі:
Мінск Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, 212. Тэл. 2-07-19.

Друкарня Белсавпрофа.
АТ 03767. Тыр. 2000. Зак. 1178.